# НАУЧНАЯ ЖИЗНЬ

**С. Я. Новікаў**

## XIV МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «БЕЛАРУСЬ І ГЕРМАНІЯ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ»

10 красавіка 2015 г. у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце адбылася XIV Міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць». Арганізатарамі чарговай сустрэчы звыш 50 даследчыкаў, у тым ліку гасцей з Германіі (Берлін, Гісэн, Лейпцыг), Латвіі (Рыга), Расіі (Арэнбург, Масква), выступілі кафедра гісторыі, сусветнай культуры і турызму МДЛУ і аддзел ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

Адкрываючы канферэнцыю, прарэктар універсітэта па навуковай рабоце А. М. Гарлатаў адзначыў, што яна праходзіць напярэдадні 70-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Юбілей зноў узняў хвалю грамадскага інтарэсу да ваеннай гісторыі, яе гераічных і трагічных старонак, малавядомых і дыскусійных пытанняў, урокаў мінулага. Менавіта юбілейнай даце прысвечана канферэнцыя, якая праводзіцца ва ўніверсітэце ў рамках выканання Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг. «Гісторыя, культура, грамадства і дзяржава» (навуковы кіраўнік – член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя). Заданне «Ваенная гісторыя» (навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар А. М. Літвін) выконваецца кафедрай гісторыі, сусветнай культуры і турызму МДЛУ (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт С. Я. Новікаў).

У заключэнні свайго выступлення А. М. Гарлатаў пажадаў удзельнікам канферэнцыі плённага абмеркавання акрэсленых навуковых пытанняў, вынікі якіх стануць важным укладам не толькі ў акадэмічную навуку, але і здольны забяспечыць вырашэнне актуальных выхаваўчых задач, асабліва ў кантэксце сучасных інфармацыйных выклікаў.

Выступленні ладзіліся ў адпаведнасці з праграмай на трох пленарных пасяджэннях. Цягам цэлага дня ішлі плённыя дыскусіі з удзелам як вядомых прафесіяналаў, так і пачынаючых даследчыкаў, аспірантаў і саіскальнікаў, хто робіць першыя крокі ў сферы даследавання ваенна-гістарычнай тэматыкі. Фактычна кожнае пленарнае пасяджэнне ўяўляла сабой самастойную міні-канферэнцыю, у цэнтры якой знаходзілася пэўная вузлавая праблема. У заключнай частцы сустрэчы адбылася прэзентацыя новых выданняў кафедры.

У ходзе першага пасяджэння «Перамога савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне: погляд праз дзесяцігоддзі» былі заслуханы навуковыя даклады айчынных і замежных даследчыкаў, у тым ліку: Р. К. Паўловіча (Мінск), К. Янэке (Берлін), К. Зеліса (Рыга), С. Бабоўскі (Берлін), І. М. Кузняцова (Мінск), А. В. Шаркова (Мінск)

Прадстаўленыя айчыннымі і замежнымі навукоўцамі матэрыялы, іх актыўнае абмеркаванне і інтарэс аўдыторыі лішні раз паказалі, што 70-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне знаходзіцца ў фукусе сучаснага даследчыцкага пошуку не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі, у тым ліку ў далёкім замежжы. Аб вялікай цане, заплачанай за перамогу савецкім народам, ішла размова ў дакладзе беларускага гісторыка Р. К. Паўловіча. Вядомы чытачам зборніка аўтар паказаў, што на франтах вайны, у савецкім тыле, на акупаванай тэрыторыі савецкія людзі аддавалі свае жыцці дзеля будучага вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пры гэтым самыя вялікія людскія страты, як адзначыў дакладчык, панесла Беларусь, дзе загінуў кожны чацвёрты яе жыхар.

На думку нямецкага гісторыка, былога дырэктара Германа-Расійскага музея Берлін-Карлсхорст К. Янэке, новы музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску захоўвае «сапраўдны дух перамогі». Новая экспазіцыя, над распрацоўкай якой у апошнія гады актыўна працавала сама выступоўца, стварае ўнікальную магчымасць для папулярызацыі гістарычных ведаў аб баявых дзеяннях Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 і ў 1943/44 гг., партызанскай барацьбе і патрыятычным супраціўленні на акупаванай тэрыторыі Беларусі, трагічных наступствах германскай акупацыі для беларускага народа і г.д. «Памяць пра вайну» – вось адна з важных назваў новай залы музея. Змясціць апошні ў шырокі кантэкст культурна-гістарычнай спадчыны, знайсці неабходныя музейныя сродкі для яе адэкватнай перадачы наведвальнікам кожнай мэтавай групы на цяперашні час і ў будучым музей вайны ў Мінску здольны па той простай прычыне, што ён адпавядае сучасным сусветным патрабаванням у музейнай справе.

Навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі і сацыялогіі Латвійскага ўніверсітэта доктар гісторыі К. Зэліс прыцягнуў увагу аўдыторыі да пытанняў адлюстравання падзей заключнага этапу вайны ў гістарыяграфіі і калектыўнай памяці жыхароў Латвіі. Даследчык адзначыў, што, з аднаго боку, Другая сусветная вайна на заключным этапе па цяперашні час знаходзіцца ў цэнтры ўвагі не толькі навукоўцаў, але і шырокай грамадскасці, выклікае актыўныя дыскусіі ў інфармацыйнай прасторы і вымушае даследчыкаў прыкладаць асобныя намаганні для далейшага вывучэння гэтай важнай гістарычнай тэмы. З другога боку, сучасная калектыўная памяць таксама патрабуе своечасовага ўліку новых інфармацыйных выклікаў, пошуку адэкватных сродкаў для захавання праўдзівых поглядаў на ваеннае мінулае.

Захаванне памяці аб гераічных і трагічных старонках вайны – адна з задач не толькі новага музея Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску. Гэтаму будзе служыць перасоўная выстава «Мемарыяльны комплекс “Трасцянец”», пра што паведаміла кіраўнік школы журналістыкі Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра імя Йаханеса Раў – С. Бабоўскі. Над стварэннем выставы працуе міжнародны калектыў гісторыкаў, музейных работнікаў,

навукоўцаў з Беларусі, Германіі і Чэхіі. Падрыхтоўка канцэпцыі і распрацоўка матэрыялаў вядзецца шляхам пошуку новых дакументальных крыніц, праз увядзенне малавядомых фактаў і імёнаў, іх скрупулёзны аналіз і ацэнку. Тэрмін адкрыцця перасоўнай выставы пакуль не вызначаны. Куратарамі гэтага праекта выступаюць міжнародныя адукацыйныя цэнтры ў Дортмундзе і Мінску.

На дамку І. М. Кузняцова, у цэнтры сучаснага грамадскага і навуковага дыскурсаў у Беларусі знаходзяцца асобныя міжнародныя пытанні пачатковага перыяду Другой сусветнай вайны. Датычна Беларусі – гэта гістарычныя падзеі 1939 і 1940 гг., звязаныя з «Катынскай трагедыяй», сярод ахвяр якой апынуліся і тыя, хто перад вайной пражываў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Толькі ў апошнія гады, дзякуючы ўвядзенню новага дакументальнага масіву і магчымасці іх аналізу без ідэалагічных клішэ, стала магчыма новае навуковае прачытанне некаторых ключавых аспектаў гэтай складанай і напружанай тэмы. На думку даследчыка, у беларукай гістарыяграфіі тут пакуль застаюцца «белыя плямы».

А. В. Шаркоў прапанаваў аўдыторыі вынікі навуковага асэнсавання пераможанага праціўніка скрозь прызму катэгорыі міласэрнасці. У першую чаргу гэта датычылася дзясяткаў тысяч немцаў, якія пасля заканчэння вайны апынуліся ў савецкім палоне. Гэта катэгорыя нямецкіх зняволеных і асуджаных, якія ўтрымліваліся ў савецкіх папраўча-працоўных установах, у пасляваенны час патрабавала пошуку як навуковага, так і палітычна-прававога рашэнняў. Апроч гэтага ў парадак дня беларуская навуковая грамадскасць ставіла пытанне аб выпрацоўцы адпаведнага маральнага стаўлення да пераможанага праціўніка.

Сярод паведамленняў, прадстаўленых на першым пасяджэнні, выклікалі асаблівы інтарэс матэрыялы А. Ф. Вялікага «Праблема Заходняй Беларусі ў савецка-польскіх адносінах перыядаў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў», К. Ганцара (Ляйпцыг) «Крыніцы па ваеннай мікрагісторыі: першыя чатыры тыдні вайны ў Брэсце летам 1941 г.», Э. Р. Іофе «Лаўрэнцій Цанава – начальнік асобага аддзела Заходняга фронту», М. В. Стральца і В. І. Білевіч «Маршал С. К. Цімашэнка на фоне рэалій XX ст.», маскоўскіх аўтараў У. В. Фядзюніна і А. А. Слабадзянюка «Па старонках гісторыі 38-га рэзервовага пагранічнага палка войск НКУС па ахове тылу Заходняга фронту».

На другім пленарным пасяджэнні «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: новыя дакументы і даследчыцкія знаходкі» прагучалі даклады У. Е. Снапкоўскага (Мінск), А. Я. Далгоўскага (Гісэн, Германія), А. М. Літвіна (Мінск), В. М. Усоскага (Мінск).

У цэнтры даклада навуковага супрацоўніка міжнароднага праекта «Белавежская пушча» А. Я. Далгоўскага былі пастаўлены ілюзіі, якія склаліся ў жыхароў пушчы ў дачыненні да вядомагаляснога масіву. Шмат кім ён

разглядаўся як месца магчымага выратавання ад нацысцкага праследу, асабліва ў ходзе правядзення карных акцый па вынішчэнні мясцовага насельніцтва, у тым ліку яўрэяў. Як лічыць даследчык, пушча не магла стаць выратавальніцай па простай прычыне – яна знаходзілася пад пільным кантролем нямецкіх ахоўных службаў.

Аб дзейнасці «зялёных партызанскіх атрадаў» падрабязна распавядаў загадчык аддзела ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін А. М. Літвін. Маскіруючыся пад партызан, такія атрады ўзнікалі ў розных раёнах акупаванай Беларусі. Сярод задач, якія вырашалі такія «ілжэатрады», было выяўленне адносін мясцовага насельніцтва да савецкіх партызан, устанаўленне з імі трывалай сувязі, правядзенне работы па разлажэнні атрадаў знутры, ліквідацыі каманда-палітычнага складу партызанскіх атрадаў. Даследчык прыходзіць да высновы, што вывучэнне гэтай праблемы неабходна працягнуць дзеля таго, каб зрабіць правільныя высновы ў высвятленні месца і ролі ілжэатрадаў у контрпартызанскай стратэгіі германскіх акупантаў.

Прафесар кафедры эканамічнай тэорыі МДЛУ У. М. Усоскі даў аналіз ваеннай эканомікі СССР у гады Вялікай Айчыннай вайны. Галоўная выснова, зробленая даследчыкам, сведчыць пра тое, што сярэднегадавая вытворчасць прадукцыі важнейшых галін цяжкай індустрыі ў СССР была істотна ніжэйшай, чым у Германіі (з улікам акупаваных тэрыторый), аднак колькасць выробленай ваеннай тэхнікі, узбраенняў і боезапасаў была ў савецкай ваеннай эканоміцы значна большай.

У паведамленнях, заслуханых на другім пленарным пасяджэнні, звярталася ўвага на новыя дакументы і даследчыцкія знаходкі, якімі ў ходзе сваіх выступленняў падзяліліся: А. П. Бязлепкін пра ўдзел беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі ў вызваленні Польшчы; І. Ю. Варанкова аб паказе апошніх месяцаў нацысцкай Германіі ў пісьмах салдат вермахта; Я. А. Грэбень пра сацыяльную характарыстыку паліцыі на акупаванай тэрыторыі Беларусі; К. І. Козак аб германскай акупацыі і становішчы мясцовага насельніцтва Беларусі (1941–1944 гг.). У ходзе пасяджэння таксама прагучалі паведамленні, якія закранулі наступную тэматыку: «Полацк падчас нацысцкай акупацыі (1941–1944 гг.)» (А. І. Корсак), «Фінансавыя аспекты сацыяльнага забеспячэння асабовага складу партызанскіх фарміраванняў і членаў іх сямей у гады Вялікай Айчыннай вайны» (В. А. Козел), «Узброеная барацьба Віцебшчыны супраць карных акцый акупантаў падчас наступальных дзеянняў Чырвонай арміі (кастрычнік – снежань 1943 гг.)» (А. А. Крыварот), «Да пытання аб колькасці разведвальна-дыверсійных, паліцэйскіх, казацкіх і іншых школ на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (С. В. Кулінок), «Картаграфічныя аспекты германскай фінансавай палітыкі на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944)» (І. Я. Куракова), «Падрыхтоўка медыцынскіх кадраў у партызанскіх фарміраваннях Беларусі ў гады Вялікай

Айчыннай вайны» (Ю. У. Матусевіч), «Колдычаўскі лагер смерці: структура, рэжым утрымання, супраціўленне вязняў» (А. М. Мох), «Расстраляны пры спробе ўцёкаў (старонкі трагічнага лёсу вязня Каўнаскага гета А. Гарніка)» (С. Я. Новікаў), «Удзел лыжных атрадаў у вызваленні Рагачова ў лютым 1944 г.» (Ф. А. Свінціцкі), «Правядзенне санітарна-прафэпідэміялагічных мерапрыемстваў у перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі Беларусі» (Я. М. Цішчанка, С. А. Сіткевіч), «Паўсядзённае жыццё салдат на франтах Вялікай Айчыннай вайны» (Р. Р. Хісамутдзінава), «Працоўныя будні ў акупаванай Беларусі ў 1941–1944 гг. (паводле матэрыялаў калекцыі дакументаў Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі “Мінск”)» (А. Г. Цымбал).

У час правядзення трэцяга пленарнага пасяджэння «Беларуска-германскія адносіны ў люстэрку гісторыі: мінулае і сучаснасць» былі заслуханы даклады і паведамленні, аўтары якіх звярталіся да розных старонак гісторыі, у тым ліку беларуска-нямецкіх узаемадачыненняў. Адкрываў пасяджэнне І. А. Саракавік тэмай «Беларускія землі ў геапалітыцы Германіі падчас Першай сусветнай вайны», які паказаў ролю беларускага краю ў планах германскіх палітыкаў па стварэнні на захопленых усходніх землях ваеннай дзяржавы Обэр-Ост.

У дакладзе М. М. Смальянінава паказаны баявыя дзеянні, якія адбыліся на беларускіх землях у жніўні – верасні 1915 г., калі ў сувязі з раздзелам Заходняга фронту на два самастойных франты – Паўночны і Заходні – камандаванне германскімі войскамі вырашыла нанесці ўрад у стык гэтых франтоў, вядомы ў гісторыі як Свянцянскі прарыў. На падставе дакументаў, выяўленых аўтарам у Расійскім ваенна-гістарычным архіве ў Маскве, паказаны ўпартыя баі, якія разгарнуліся і вяліся за ўтрыманне разрыву паміж франтамі на лініі Солы – Смаргонь – Маладзечна.

Аб гатоўнасці сучаснага грамадства да ўсведамлення Вялікай Айчыннай вайны ішла размова ў дакладзе Г. С. Хадасевіч і С. І. Бусько, якія прааналізавалі турыстычны патэнцыял Беларусі ў аспекце захавання памяці аб вайне ў помніках і мемарыялах, а таксама маштабах іх турыстычных наведванняў. Кажучы пра сучаснае пакаленне, аўтары адзначылі, што яно страчвае боль да той трагедыі, якая за часам вайны выпала на долю беларускага народа. Аўтары паказалі, што на перадавую лінію па наведванням выходзяць такія комплексы, дзе наведвальнікаў чакаюць забаўляльныя гульні ці экспанаты для інтэрактыўных заняткаў.

У паведамленнях даследчыкі закранaлі розныя аспекты беларуска-нямецкіх адносін не толькі ў далёкім мінулым, але і ў пасляваенны перыяд развіцця БССР і на сучасным этапе дзейнасці Рэспублікі Беларусь. Тэмы палітыкі, эканомікі, культуры былі адлюстраваны аўтарамі ў наступных паведамленнях: Н. В. Барабаш – «Мабілізацыя працоўных рэсурсаў БССР на аднаўленне прамысловасці (1941–1944)», Я. І. Бараноўскага – «Уклад

Беларусі ў масавую падрыхтоўку зарубежных спецыялістаў (1980–1991)», В. В. Брыгадзінай – «Савецкае грамадства: жыццё пасля вайны (1945–1953)», Д. А. Буконкіна – «Беларуска-нямецкія адносіны, іх роля і месца ў рэалізацыі нацыянальнай і дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь», Р. Б. Гагуа – «Паўстанне 1409 года ў Жамойці ў Прускім і Польскім летапісаннях XV ст.», В. М. Галай – «Семантычны аспект ужывання германізмаў у беларускім літаратурна-мастацкім тэксце», А. І. Еўстраццева – «Унутрыпалітычныя канфлікты ў Герцагстве Курляндыя і Сямігалія (канец XVI – пачатак XVII ст.)», В. С. Забродскай – «Эпіталама І. Мюліўса на шлюб Філона Кміты і Соф'і Хадкевіч (1564)», В. А. Латышавай – «Губернскі Віцебск – прыстанак міласэрнасці ў гады Першай сусветнай вайны», В. Г. Мазеца – «Працэс інстытуалізацыі беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах германскай акупацыі (1918)», Д. А. Мігуна – «Савецка-германскія знешнепалітычныя кантакты напярэдадні Другой сусветнай вайны», А. М. Кушнярэвіча – «Роля нямецкага архітэктара Іагана Глаўбіца ў развіцці барочнай стылістыкі беларускага дойлідства», Л. А. Козік «Да пытання аб канструкцыі і дэканструкцыі нацыянальных гістарычных міфаў (на прыкладзе польскага руху супраціўлення ў гады Другой сусветнай вайны)», І. А. Літвіноўскага і Ю. І. Літвіноўскай – «Урэгуляванне савецка-германскіх адносін напярэдадні Другой сусветнай вайны)», І. У. Нікалаевай – «Паўсядзённае жыццё гарадскога насельніцтва Віцебшчыны ў пасляакупацыны перыяд Вялікай Айчыннай вайны (восень 1943 – вясна 1945 гг.)», А. М. Рэзніка – «Роля ідэалагемы Вялікага кастрычніка ў спасціжэнні гістарычнага сэнсу Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг.)», Н. А. Царук і Н. Л. Улейчык – «Наступствы Вялікай Айчыннай вайны для сістэмы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай педагагічнай адукацыі ў заходніх абласцях Беларусі (1944–1946)».

Апошняя кропка ў рабоце была пастаўлена прэзентацыяй, падчас якой кафедра гісторыі, сусветнай культуры і турызму прадставіла ўдзельнікам канферэнцыі новыя выданні, сярод якіх манаграфія С. Я. Новікава «Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў» (2-е выд., выпр. і дап. Смаленск: Універсум, 2015. – 436 с.) і чарговы 13-ы выпуск матэрыялаў Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць» (Мінск: МДЛУ, 2015. Ч. І. – 180 с.; Ч. ІІ. – 160 с.).

Напрыканцы адбылося падвядзенне вынікаў канферэнцыі. Удзельнікі звярнулі ўвагу на такі важны момант, што навуковае абмеркаванне ў фармаце канферэнцыі гістарычнага феномена Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца адметнай формай вядзення сучаснага навуковага дыскурсу з удзелам даследчыкаў нашай краіны, краін СНД і далёкага замежжа. Добрай прыкметай штогадовых сустрэч ваенных гісторыкаў стала рэгулярнае выданне матэрыялаў Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць».